4. Основные положения проекта программы социально-экономического развития Республики Беларусь на 2021–2025 годы [Электронный ресурс]. URL: http://brest-region.gov.by/index.php/obshchestvo/k-edinomu-dnyu-informi-rovaniya/12023-yanvar-2021-osnovnye-polozheniya-proekta-programmy-sotsialno-ekonomicheskogo-razvitiya-respubliki-belarus-na-2021-2025-gody (дата обращения: 26.02.2021).

# НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ АСВЯТЛЕННЯ КУЛЬТУРНАЙ ТЭМАТЫКІ Ў ВЫДАННЯХ ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

***Н. В. Кузьміч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*kuzmich_nv@mail.ru*

У матэрыяле разглядаюцца некаторыя асаблівасці выкарыстання культурнай тэматыкі на сайтах раённых газет Гродзенскай вобласці.

***Ключавыя словы:*** культурная тэматыка; раённыя выданні; прэса.

# SOME FEATURES OF COVERAGE OF CULTURAL THEMES IN THE PUBLICATIONS OF THE GRODNO REGION PRESS

***N. V. Kuzmich***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. V. Kuzmich (kuzmich_nv@mail.ru)*

The article considers some features of the use of cultural themes on the sites of district newspapers of the Grodno region.

***Key words:*** cultural themes; district publications; press.

У эпоху глабалізацыі праблема захавання культурнай спадчыны не толькі не губляе свайго значэння, а набывае асаблівую актуальнасць. Праблема звароту да сваіх гістарычных крыніц актуальная заўсёды. І важную ролю ў захаванні і развіцці культуры малых гарадоў адыгрывае мясцовая прэса. Акрамя сваёй галоўнай функцыі – інфарматыўнай,

мясцовыя выданні выконваюць яшчэ і ролю рэтранслятара сэнсаў культуры. Несумненна, мясцовы друк аказвае значны ўплыў на культурныя працэсы ў рэгіёне і фарміруе іх інфармацыйнае поле. Менавіта раённыя выданні тут адыгрываюць важнае значэнне, бо ў агульнарэспубліканскай прэсе не часта можна сустрэць інфармацыю пра падзею ў гісторыі канкрэтнай мясцовасці або інфармацыю пра творчасць знакамітага мясцовага творцы. Гэта – пляцоўка для мясцовай прэсы. Таму мясцовыя выданні заўсёды адрозніваліся сваёй скіраванасцю на захаванне культурнай спадчыны, традыцый, гісторыі канкрэтнага населенага пункта.

Звяртаючы ўвагу на ролю мясцовай прэсы, варта зазначыць, што аналітычная функцыя не вельмі моцна ўплывае на тэматычную структуру перыядычнага выдання. Зразумела, што ў раённых газетах тэма культуры займае не асноўнае месца, але на азначаную тэму з’яўляюцца матэрыялы розных жанраў, дзе ўзнімаюцца актуальныя пытанні мясцовага значэння. База для падзейнай інфармацыі ў галіне культуры тут не такая ўжо і вялікая, таму значную ролю ў яе стварэнні адыгрываюць у асноўным бібліятэкі, музеі, літаратурныя аб’яднанні, дзякуючы энтузіастам-супрацоўнікам якіх з’яўляюцца новая інфармацыя і матэрыялы з архіваў раённых сховішчаў.

Гаварыць пра культуру неабходна, прычым рабіць гэта варта, па магчымасці, сістэматычна і якасна. А мясцовыя выданняі маюць пэўную перыдычнасць выхаду, пастаянную аўдыторыю, таксама традыцыі, закладзеныя папярэднімі пакаленнямі журналістаў. Сувязь з мінулым, з культурнымі і гістарычнымі традыцыямі – важны накірунак дзейнасці мясцовых СМІ. Напрыклад, архіў мясцовага друку з’яўляецца каштоўнай крыніцай гістарычных і культурных фактаў жыцця канкрэтнага населенага пункта – своеасаблівым летапісам горада. Акрамя таго, для чалавека важная самаідэнтэфікацыя – дзякуючы вывучэнню архіва мясцовага друку мы можам уявіць сябе жыхаром пэўнага горада, суадносім сябе з гэтай тэрыторыяй, з дадзенай культурай, гісторыяй і традыцыямі [1]. Рэалізацыя культурафарміруючай функцыі выдання залежыць, з аднаго боку, ад асаблівасцей асобы журналіста. А з другога – ад асаблівасцей інфармацыйнай палітыкі выдання ў цэлым. Размова ідзе не аб аб’ектыўнай інфармацыі ў сферы культуры, а аб суб’ектыўным стаўленні да норм і каштоўнасцяў, якія абумоўлены рэдакцыйнай палітыкай і ўзнаўляюцца або рэтранслююцца канкрэтным журналістам. Таму выбар выдання і публікацыі чытачом, па сутнасці, з’яўляецца выбарам для размовы субяседніка, які павінен адпавядаць пэўным умовам чытача [2].

На электронных рэсурсах рэгіянальных газет прысутнічае культурная тэматыка ў рознай меры, заканамерна, што яна ў пэўным сэнсе дубліруецца з матэрыяламі друкаванага выдання, але мае сваю спецыфіку і падачу. Тым не менш яна ёсць і займае пэўнае месца. Несумненна, па-рознаму асвятляецца ў розных выданнях, а значыць, па-рознаму напаўняецца культурны кантэкст. Напрыклад, на сайце «Бераставіцкай газеты» ёсць асобны раздзел «Культура», дзе большае месца адведзена мясцовым падзеям (напрыклад, «Вереск» подтвердил звание народный» ад 02.05.2021, «Спортивный калейдоскоп». Игровая программа для детей в честь Первомая проведена в Большой Берестовице» ад 01.05.2021, «Пасочница, писанки, крашенки. Для старшеклассников и лицеистов провели музейное занятие по традициям Пасхи» ад 29.04.2021, інш.). Матэрыял складаецца з невялікай інфармацыйнай часткі і вялікай колькасці фотаздымкаў, дзе буйным планам прадстаўлены ўдзельнікі мерапрыемстваў. Таксама ёсць рубрыка, якая складаецца і з матэрыялаў культурнай скіраванасці на сайце «Воранаўскай газеты» – гэта «Культура і духовность» (дзе таксама месца адводзіцца мясцовым падзеям у сферы культуры – «Вячоркі ў Місявічах» ад 30.04.2021, «Свята «Паляцкішская ляндрынка» ўпершыню прайшло ў мінулую нядзелю ў Паляцкішках» ад 26.04.2021, «В занимательном мире книг» ад 05.04.2021, інш.). Таксама «Астравецкая праўда» выдзяляе месца матэрыялам мясцовай скіраванасці ў рубрыцы «Культура» – «Вторая жизнь ретро-музыки» ад 02.05.2021, «Когда откроется киноконцертный зал «Островец» « ад 29.04.2021, «У Варнянах адкрылася выстава маляванак Ніны Бохан» ад 29.04.2021, інш. А вось у «Ашмянскім весніку» асобная рубрыка, прысвечаная культурнай тэматыцы, не кідаецца ў вочы на ленце сайта, матэрыялы азначанай тэмы ўваходзяць у іншыя рубрыкі сайта.

Зразумела, што, калі размова ідзе пра пэўную тэматыку на старонках прэсы, справа тут не толькі ў колькасці публікацый. Гэта не галоўная вартасць, якая вызначае месца культурнай тэматыкі ў выданні, а толькі адна з умоў, каб тэма мела паслядоўнае і пастаяннае гучанне.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Халтурина М. Л.* Современный медиадискурс: тема культуры на страницах местной печати [Электронный ресурс]. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/sovremennyy-mediadiskurs-tema-kultury-na-stranitsah-mestnoy-pechati-na-primere-gazet-uralskogoregiona/viewer (дата обращения: 03.05.2021).
2. *Хоссейнзаде С.* Тематические особенности публикаций о культуре в печатных СМИ [Электронный ресурс]. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/tematicheskie-osobennosti-publikatsiy-o-kulture-v-pechatnyh-smi/viewer (дата обращения: 03.05.2021).